сённяшні воблік рэспублікі, але ж і яны красамоўна сведчаць аб тым, што дала беларускаму народу ленінская нацыянальная палітыка КПСС, братняя дружба і ўзаемадапамога савецкіх народаў. Толькі ў саюзе рэспублік, толькі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, толькі агульнымі намаганнямі мы змаглі пакончыць з эканамічнай і культурнай адсталасцю, адолець фашысцкую навалу і тым захаваць сябе як вольную нацыю, у кароткі тэрмін аднавіць разбураную вайной народную гаспадарку, навуку, дасягнуць велізарных сацыяльных заваёў. Кожны беларус, кожны працаўнік нашай рэспублікі глыбока ўсведамляе гэта не толькі розумам, але і сэрцам.

Канечне, далёка не ўсё ў нас добра, не ўсе справы ідуць гладка. Мы, савецкія людзі, глядзім на рэчы рэальна, бачым і недахопы, хібы, нявырашаныя праблемы. Над вырашэннем шэрагу вельмі важных, надзённых пытанняў вядзецца цяпер карпатлівая, мэтаскіраваная работа, прыкладаюцца ўсе сілы, каб паспяхова выканаць планы адзінаццатай пяцігодкі, рашэнні XXVI з'езда КПСС.

Працаўнікі прамысловасці рэспублікі нарошчваюць тэмпы вытворчасці галоўным чынам за кошт больш эфектыўнага выкарыстання існуючых магутнасцей, тэхнічнага пераўзбраення, укаранення прагрэсіўных тэхналогій. Як сведчаць папярэднія вынікі, яны паспяхова выконваюць планавыя заданні другога года адзінаццатай пяцігодкі і сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя ў гонар 60-годдзя ўтварэння Саюза ССР.

Выконваючы гістарычныя рашэнні XXVI з'езда партыі, майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, працаўнікі сельскай гаспадаркі рэспублікі імкнуцца памножыць свой уклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы краіны. Вырашаецца задача: павялічыць сярэднегадавую вытворчасць збожжа на 26—31 працэнт, павысіць зборы бульбы, цукровых буракоў і іншых сельскагаспадарчых культур. Узяты курс на максімальнае павелічэнне надояў малака ад кожнай каровы, прывагу жывёлы на адкорме. У рэспубліцы ствараюцца новыя комплексы па вырошчванню і адкорму буйной рагатай жывёлы, свіней, ажыццяўляюцца важныя арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы, якія ахопліваюць пытанні планавання, кіравання, укаранення навуковых дасягненняў і новай тэхнікі, падрыхтоўкі спецыялістаў, а таксама пытанні жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў вёсцы.

Шасцідзесяцігадовая гісторыя Саюза ССР — гэта і гісторыя ўсенароднага развіцця савецкай дэмакратыі. Ад Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў да Саветаў дэпутатаў працоўных, а потым — да Саветаў народных дэпутатаў — такі слаўны шлях пройдзен органамі народнай улады першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Новая Канстытуцыя СССР і Канстытуцыя Беларускай ССР значна ўмацавалі статус усяе сістэмы органаў улады, пашырылі іх правы. Магутным творчым зарадам для наступнай актывізацыі дзейнасці Саветаў усіх звенняў сталі рашэнні XXVI партыйнага з'езда.

Саветы рэспублікі, пачынаючы ад Вярхоўнага і канчаючы пасялковымі і сельскімі, аб'ядноўваюць 85.883 дэпутаты. Гэта па-сапраўднаму прадстаўнічыя органы народаўладдзя. Сярод дэпутатаў мясцовых Саветаў рэспублікі дзве трэція часткі складаюць рабочыя і калгаснікі, амаль палову — жанчыны, кожны пяты дэпутат — камсамолец. У органы ўлады абраны прадстаўнікі 39 розных нацыянальнасцей. У полі зроку і Вярхоўнага Савета рэспублікі, і мясцовых органаў улады знаходзяцца вузлавыя праблемы, звязаныя з рэалізацыяй заданняў пяцігодкі, выкананнем Харчовай праграмы,— максімальнае выкарыстанне магчымасцей для павелічэння вытворчасці і паляпшэння якасці тавараў народнага ужытку, удасканаленне абслугоўвання насельніцтва, выкананне планаў будаўніцтва жылля, школ, клубаў, бальніц і гэтак далей. Вырашаючы такое шырокае кола задач, Саветы ўсё актыўней умешваюцца ў жыццё, настойліва ўдасканальваюць сваю шматгранную дзейнасць.

Рабочыя і сяляне Беларусі, як і ўсе працоўныя нашай краіны, якія аднагалосна вырашылі ўвайсці ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, ганарацца тым, што збыліся іх самыя смелыя мары, апраўдаліся самыя высокія надзеі.





Слава Беларусі.

Фотаэцюд Ю. ІВАНОВА.